Андрэй Карэцкі

# Гісторыя аднаўлення Мірскага замка у другой палове XVII – пачатку XX стст.

Аналіз гісторыі Мірскага замка пераканаўча сведчыць, што першыя спробы яго аднаўлення непарыўна звязаныя з гісторыяй нашай краіны. Так сталася, што амаль усе значныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі з моманту будаўніцтва комплексу ўнеслі свае карэктывы ў агульны выгляд пабудовы. Пры гэтым, да асноўных прычын разбурэння і пераробкі замка адносяцца войны, а таксама патрабаванні новых стылістычных напрамкаў.

Паводле сведчанням інвентароў і эканамічных дакументаў Мірскай латыфундыі другой паловы XVII ст. першыя ў гісторыі замка рамонтныя працы пачаліся ў пачатку 1680-х гг. Аднаўленчы працэс ажыццяўляўся ў сувязі з вялікімі разбурэннямі, якія атрымаў комплекс у 1655 г. у выніку аблогі казацкімі атрадамі Яна Залатарэнкі і маскоўскага ваяводы Аляксея Трубяцкога [6, с. 46]. Інвентар замка, складзены 14 жніўня 1660 г. адзначае, што ў перыяд ваенных дзеянняў былі знішчаны многія архітэктурныя элементы, гаспадарчыя рэчы разрабаваныя, пакоі спустошаны, княжацкі фальварак і “італьянскі сад” спалены [9, л. 283].

Архіўныя матэрыялы паказваюць, што ў далейшыя гады комплекс быў яшчэ разбураным, паколькі аналіз эканамічных дакументаў Мірскага графства за перыяд 1660–1680 гг. не выявіў наяўнасці рамонтнага працэсу. У крыніцах адзначанага перыяду замак згадваецца даволі мала і, пераважна, у сувязі з гаспадарчымі справамі Мірскай латыфундыі. Толькі ў апісанні 1681 г. упершыню пасля разбурэння сустракаецца слова “рэстаўрацыя” [3, с.129].

Шырокі аналіз крыніц апошняй чвэрці XVII ст. сведчыць, што асноўны аб’ём рамонтных работ на Мірскім замку ажыццяўляўся ў перыяд 1681–1688 гг. (інвентар 1688 г. ужо апісвае адрамантаваны замак). За гэты час былі ўзноўленыя амаль усе вокны і дзверы на палацы, пакрытыя дахам вежы, памяшканні прыведзены ў належны стан і, нарэшце, адноўлены фальварак [11, л.14–19].

Тым не менш, гэтыя працы не былі дастаткова раўнамернымі. У гаспадарчых дакументах графства перыяду 1681–1684 гг. даволі мала ўпамінаецца рэестр работ на замку. Гэты факт азначае, што рэстаўрацыйны працэс дадзенанага перыяду не быў дастаткова інтэнсіўным. Найбольшага руху ён дасягнуў у межах 1685–1688 гг., паколькі за гэты час назіраецца значная колькасць эканамічных матэрыялаў, у якіх тым ці іншым чынам упамінаюцца замкавыя працы.

Шырокі аналіз вопісу замка 1688 г. паказвае, што аднаўленне комплекса не адпавядала таму ўзроўню, які ён меў да 1655 г. На гэта паўплывалі шэраг аб’ектыўных прычын, галоўнымі з якіх з’яўляюцца гаспадарчыя цяжкасці. Разам з тым, рэстаўрацыйныя работы ў перыяд з 1681

па 1688 гг. не дазволілі ў поўнай меры вярнуць замку ранейшыя элементы, тым самым змяніўшы (хоць і не значна) агульны прадстаўнічы яго выгляд, паколькі падчас іх правядзення некаторыя замкавыя элементы не аднаўлялі або перараблялі іншым чынам. Тым не менш, нягледзячы на дадзеную акалічнасць Мірскі замак захаваў свае першапачатковыя стылістычныя набыткі часоў готыкі і рэнесансу, пашкоджаныя структурныя часткі якіх падчас рамонту былі толькі спрошчаныя або ўвогуле не аднаўляліся [11, л. 14].

Наступны храналагічны перыяд аднаўлення замка звязаны з падзеямі пачатку XVIII ст. Праз шаснаццаць гадоў пасля першага рамонту комплекс зноў быў пашкоджаны. У 1706 г. у Мір уварваліся войскі Карла XII, якія ўзялі штурмам і спалілі замак, нанёсшы яму яшчэ большыя страты, чым гэта было ў мінулую вайну [5, с. 148]. Аб разбурэнні ўпамінаецца ў інвентару 1719 г. Вопіс дастаткова добра паказвае выгляд пабудовы пасля аблогі: спустошаныя пакоі палацавых карпусоў, закопчаныя агнём сцены, адсутнасць дзвярэй і вокнаў, часткова знішчаны дах на вежах і інш [12, л. 608].

У архіўных дакументах 1706–1720 гг. грунтоўнага аднаўлення Мірскага замка не зафіксавана. Тым не менш нейкія работы на ім ўсё ж ажыццяўляліся. Так, згодна вопісу 1719 г., на вокнах замест разных абрамленняў з’явілася простая штукатурка, а некалькі з іх увогуле залажылі цэглай або забілі дошкамі, дах палацу і вежаў быў пакрыты часткова гонтам і чарапіцай, інтэр’ерная часка (пераважна палацавыя карпусы) знаходзілася яшчэ ў спустошаным стане [12, л. 608]. Толькі ў 1720 г. адзначаецца крыніцамі выдзяленне значнай колькасці грошай на рамонт вокан палаца і набыццё неабходных будаўнічых матэрыялаў, што дазваляе вызначаць дадзены факт як пачатак асноўнай рэстаўрацыі [12, л. 428]. Прасачыць ход работ дазваляюць гаспадарчыя разлікі адміністрацыі графства з майстрамі, дзе ўказваецца аб’ём выкананых імі прац, а таксама апісанне комплексу за 1722 г. [13, л. 13]. Апошняе нават досыць добра адзначае асаблівасці рамонтнага працэсу першых двух гадоў аднаўлення [13, л. 11–14]. У прыватнасці, тут гаворыцца, што першапачаткова аднаўлялі знешнія замкавыя канструкцыі [13, л. 14]. Да 1722 г. поўнасцю адбудавалі будынак новага фальварка непадалёк ад замка, гаспадарчыя пабудовы, што размяшчаліся ў замкавым двары (млын, стайню) [13, л. 14]. У самым комплексу ўставілі новыя вокны, дзверы; на палацу і вежах часткова ўзнавілі дах, у галоўнай вежы – драўляную браму.

Уявіць ход далейшага этапу аднаўленчых работ па архіўным крыніцам дастаткова цяжка, паколькі большасць дакументаў выразна не адлюстроўваюць патрэбным чынам увесь рамонтны працэс. Тым не менш пазнейшыя апісанні пабудовы, у тым ліку і інвентары 1778 і 1794 гг., дазваляюць вызначыць характэрныя адметнасці аднаўлення, а таксама

выявіць новыя архітэктурна-стылістычныя элементы, уведзеныя ў замак падчас рамонту [14, л. 460, 15, л. 4].

Шырокі аналіз гаспадарчых дакументаў Мірскага графства паказвае, што ў асноўным замак быў адноўлены да сярэдзіны 30-х гг. XVIII ст. Аб гэтым сведчаць у першую чаргу крыніцы ў перыяд 1730–1740-хх гг., дзе ўжо не прасочваюцца актыўныя рамонтныя працы. Разам з тым, дадзеныя крыніцы адзначаюць, што некаторыя работы на замку яшчэ працягваліся і пасля грунтоўнага аднаўлення, аднак яны ўжо не мелі той маштабнасці. Варта адзначыць, што рэстаўрацыя 20– 30-хх гг. XVIII ст. мае свае асаблівасці. Калі падчас аднаўленчых работ 1681– 1688 гг. комплексу вярнулі страчаныя ў вайну элементы, то ўжо ў працэсу другога аднаўлення працы пераарыентаваліся на значную пераробку пераважна інтэр’ернай часткі, што прывяло да стылістычных змен на замку. Пануючай стылістыкай адзначанага перыяду ў Еўропе было позняе барока – антыкласічны напрамак у архітэктуры і мастацтве, які адлюстроўваў эстэтычныя ідэалы магнатаў першай паловы – сярэдзіы XVIII ст. [2, с. 10].

Паводле новаму мастацкаму напрамку падчас аднаўлення быў аздоблены і Мірскі замак. Па загаду ўладальніка пабудовы Міхаіла Казіміра Радзівіла майстры поўнасцю перарабілі ўсю ўнутраную частку палацавых карпусоў. У сувязі з тым у інтэр’еры замка ўводзяцца раней не характэрныя гатычнаму і рэнесанснаму стылям элементы [4, с. 46].

Саму рэстаўрацыю Мірскага замка перыяду 1720–1730-хх гг. патрэбна разглядаць як працэс не толькі аднаўленчы, але і, у значнай ступені, творчы. Апошняя выснова ўзнікае з прычыны таго, што дадзеныя грунтоўныя рамонтныя працы сваёй сутнасцю адыйшлі ад простага аднаўлення пашкоджаных канструкцый і былі накіраваныя на пераробку часткі замка паводле патрабаванняў новай стылістыкі.

На працягу далейшага часу ўладальнікі ўжо не аднаўлялі замак. Найбольш адметнай падзеяй у сэнсе захавання Мірскага палацава-замкавага комплексу дадзеных храналагічных межаў варта адзначыць толькі рамонтныя работы другой паловы XIX ст. У 1870 г. на чатырох вежах, акрамя ўзарванай паўночна-ўсходняй, майстры зрабілі часовыя гонтавыя дахі з мэтай забеспячэння належных умоў існавання пабудовы [7, с. 209]. Аб гэтым сведчыць знойдзеная на замку драўляная бэлька, дзе дакладна ўказваецца адзначаная вышэй дата [5, с. 150]. Дадзены факт сучаснай навукай лічыцца першым прыкладам кансервацыі архітэктурнага аб’екта як помніка старажытнасці на Беларусі [3, с. 110].

Новы аднаўленчы перыяд на Мірскім замку назіраецца толькі ў першай чвэрці XX ст. Рэстаўрацыйныя работы пачаліся па загаду ўладальніка пабудовы князя Міхаіла Святаполк-Мірскага ў 1922 г. [7, с. 209]. Згодна праекту аднаўлення, які выканаў у 1924 г. варшаўскі архітэктар Тэадор Буржэ, планавалася, што аднаўленне закране ўсе замкавыя элементы (палац,

вежы, сцены), аднак гаспадарчыя цяжкасці ўжо з першых рэстаўрацыйных гадоў паказалі складанасць пастаўленай задачы. Разам з тым не меншую ролю ў гэтым грала і значная разбуранасць Мірскага замка. Архіўныя дакументы, у ліку якіх і фатаграфічныя матэрыялы 20–30-хх гг. XX ст., а таксама шматлікія сведчанні даследчыкаў 1915–1938 гг. (Ю.Ядкоўскага, Г.Лаўмянскага, У.Абрамовіча і інш.) паказваюць наяўнасць досыць вялікіх архітэктурна-мастацкіх страт, атрыманых замкам у перыяд з 1794 па 1922 гг. [8, с. 22; 15, л. 4].

Улічваючы вышэй вызначаную акалічнасць можна дакладна сцвярджаць, што рэстаўрацыйныя работы першай паловы XX ст. па сваёй маштабнасці і складанасці выканання пераўзыйшлі ўсе ранейшыя аднаўленні, паколькі неабходна было аднавіць пашкоджаныя элементы ўсёй аб’ёмна-планавай структуры замка (палац, вежы, сцены) і адначасова рэканструяваць унутраную прастору.

Першапачаткова асноўныя працы сканцэнтраваліся на рамонту знешніх элементаў – да 1928 г. майстры ўставілі вокны і дзверы, пакрылі дахоўкай частку палаца [5, с. 150]. За перыяд 1922–1929 гг. была поўнасцю адноўлена паўдёва-заходняя вежа, муроўка сцен усходняга корпусу палаца [3, с. 117].

З 1934 па 1939 гг. аднавілі пяць пралётаў усходняга крыла палаца і дзве вежы: паўднёва-ўсходнюю і частку паўночна-заходняй [1, с. 184]. Разам з тым у значнай ступені рамонт захапіў і ўнутраную прастору замка. Аднак з усіх залаў палацавых карпусоў аднавілі толькі адзін, а астатнім пакоям забяспечылі мінімальныя бытавыя ўмовы [8, с. 20]. Адначасова ў комплекс уводзяцца новыя элементы, характэрныя для 1920–1930-хх гг.: невялікая кацельня ў сутарэннях для атаплення, тэлефонная сувязь, жалезныя вінтавыя лесвіцы з балконам (захаваліся да нашага часу на палацы) і інш [8, с. 21].

У перыяд 20–30-хх гг. XX ст. асобныя аднаўленчыя працы ажыццяўляюцца ў адносінах шэрагу беларускіх абарончых комплексаў, аднак па сваёй маштабнасці яны не маглі параўнацца з рэстаўрацыяй Мірскага замка – апошняя на той час была самай грунтоўнай на Беларусі. Згодна сучасным патрабаванням навукі аднаўленчыя працы 1922–1939 гг. не адпавядалі патрэбным нормам, паколькі не праводзіліся гістарычнае, архітэктурна-мастацкае, археалагічнае даследаванні – характэрная навуковая паслядоўнасць сучаснага рэстаўрацыйнага працэсу. Змяніўся і выгляд помніка – комплекс набыў новыя не характэрныя яго першаснай стылістыцы элементы (балконы, жалезныя лесвіцы). Тым не менш дадзеныя працы з’яўляюцца першай рэстаўрацыяй Мірскага замка, паколькі адпавядалі метадалагічным нормам свайго часу, а спецыялісты-рэстаўратары адносіліся да яго як да помніка старажытнасці.

На працягу свайго існавання комплекс зведаў не адно аднаўленне і перабудову, аднак дадзеныя працэсы не ўнеслі сур’ёзных змен у яго аб’ёмна-планавую і кампазіцыйную сістэмы. Разам з тым Мірскі замак захаваў свае

першапачатковыя стылістычныя элементы часоў готыкі і Рэнесансу, набыўшы пры гэтым новыя ўнікальныя напластаванні характэрныя стылістыцы барока і рамантызму. У сувязі з гэтым стылявая насычанасць помніка вызначаецца дастаткова багатымі мастацкімі якасцямі, якая тым не менш не перашкаджае ўспрыняццю яго як адзінай непадзельнай пабудовы. Адначасова тыя напластаванні, якія замак набыў у працэсе аднаўленняў і пераробак, уяўляюць не меншую архітэктурна-мастацкую каштоўнасць чым яго ранейшыя кампазіцыйныя элементы. У сукупнасці з першапачатковымі стылёвымі рысамі (готыка, рэнесанс) яны і сфарміравалі той выгляд, які дазволіў аднесці комплекс да пабудоў сусветнай каштоўнасці.

Літаратура:

**1.** Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння. – Мн., 1996. – 192 с.

**2.** Гісторыя беларускага мастацтва: У 6-ці т. Т. 2. Другая палова XVI – канец XVIII ст. / Рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш.; Рэд. тома Я.М. Сахута. – Мн., 1988. – 384 с.: іл.

**3.** Калнін В.В. Мірскі замак. – Мн., 2002. – 160 с.: іл.

**4.** Кулагин А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: Вторая половина XVIII – начало XIX вв. – Мн., 1981. – 134 с.: ил.

**5.** Митянин А.Я. Оборонительные сооружения Белоруссии XIII–XVII вв. – Сборник научных работ Ин-та строительства и архитектуры АН БССР. – Мн., 1958, вып. №1. – С. 135–164.

**6.** Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. Мн., 1969. – 263 с.: ил.

**7.** Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал. Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1999. – 592 с.

**8.** Abramowicz W. Strony Nowogorodzkie: Szkice krajoznawce. Lida, 1938. – 136 s.

**9.** НГАБ, ф. 694; воп. 2, спр. 4466.

**10.** НГАБ, ф. 694; воп. 2, спр. 4467.

**11.** НГАБ, ф. 694; воп. 2, спр. 4468.

**12.** НГАБ, ф. 694; воп. 2, спр. 4469.

**13.** НГАБ, ф. 694; воп. 2, спр. 4473.

**14.** НГАБ, ф. 694; воп. 2, спр. 4484.

**15.** НГАБ, ф. 694; воп. 2, спр. 4486.